ского управления восточных земель – за многочисленные нарушения прав белорусов в Польше. Но в тот период, несмотря на заявления членов БПК о «непримиримой оппозиционности» к государственной политике, надежды на получение автономии все же заставляли белорусский клуб придерживаться более умеренной линии в отношениях с правительством.

Позже газета христианских демократов «Беларуская крыніца» писала по этому поводу: «БПК не имел изначально ясной политической линии. Белорусские депутаты голосовали при выборах президента за Нарутовича, но отказали в поддержке Войцеховскому… Белорусские депутаты поддержали кабинет генерала Сикорского…» [6, 1927 – 28. 01]. Один из членов клуба В. Рагуля также отмечал, что политику БПК на начальном этапе можно было трактовать как соглашательскую, но именно это, по его мнению, доказало, что поляки не желают идти даже на минимальные уступки и привело к быстрой радикализации позиции послов [3, с. 112].

Польская сторона существование БПК воспринимала, как реальную угрозу своим ассимиляционным планам и все ее действия были направлены на то, чтобы ослабить, разобщить клуб. Уже в марте 1923 г. за решеткой оказался посол С. Баран, обвиненный в связях с эсеровским подпольем; спасаясь от преследований, эмигрировал в Литву С. Яковюк, а в БССР – М. Коханович. В. Калиновского лишили мандата из-за отсутствия польского гражданства [5, с. 51]. «БПК почти всегда проводит агитацию враждебную Польше», – указывалось в служебной записке МВД [2, л. 211].

Отсутствие взаимопонимания, новый виток репрессий, заставили осенью 1923 г. большинство членов клуба отказаться от каких-либо попыток сотрудничества с польскими властями. При особом мнении остался лишь председатель БПК Б. Тарашкевич, продолжая настаивать на лояльном отношении к властям, все еще не исключая возможности компромисса.


1. Белорусский государственный архив-музей литературы и искусства (БДАМЛіМ). – Ф. 3. Воп. 1, спр. 207.
2. Национальный архив республики Беларусь (НАРБ). – Ф. 242. Воп. 1, спр. 153.
3. Рагуля, В. Успаміны / В. Рагуля // Спадчына. – 1994. – № 4. – С. 107 – 127.
4. Сидоревич, А. Антон Луцкевич / А. Сидоревич // Неман. – 1990. – № 7. – С. 91 – 167.
5. Bergman, A. Bronislaw Taraszkiewicz a lewica belwederska /A. Bergman // Kwartalnik Historyczny. – 1968. – № 1. – S. 41 – 58.
6. Kryniса // Орган БХДЗ (1917 – 1925).
7. Stankiewic, Ad. Bielaruski Chryscijanski ruch / Ad. Stankiewic – Vilnia, 1939. – 272 s.


## ДЗЕЙНАСЦЬ БЕЛАРУСКІХ СТУДЭНТАЎ У ІТАЛІІ Ў 1920-Я ГАДЫ

В.У. Коваль (Мінск, Беларусь)

Спадчына беларускай дыяспары стала адной з найбольш актуальных тэм сучасных даследчыкаў. У апошніх навуковых публікацыях падкрэсліваецца ідэя, што важным крытэрыем для фарміравання дыяспары з’яўляецца працэнт інтэлектуальнай эліты нацыі ў асяродку замежжа, што ўплывае на магчымасць самаідэнтыфікацыі эміграцыі ў новых культурных умовах. Даследаванне дзейнасці беларускіх студэнцкіх арганізацый пашырае ўяўленні пра складаны працэс фарміравання беларускай інтэлігенцыі ў асяродку замежжа.

Міжваенная эміграцыйная хваля фарміравалася ў асноўным з ліку жыхароў Заходняй Беларусі, якая з 1921 г. уваходзіла ў склад Польшчы. Беларускія эмігранты пакідалі Бацькаўшчыну не толькі па эканамічных, але і па палітычных прычынах. Асобным пытаннем даследавання з’яўляецца вывучэнне кірункаў дзейнасці беларускага студэнцтва ў розных краінах свету, іх арганізацыйная праца і палітычныя праекты.

Дыскрымінацыйная палітыка польскіх улад у галіне адукацыі прымушала беларускую моладзь ехаць вучыцца за мяжу. Беларускія грамадскія арганізацыі і палітычныя лідэры рэгулярна заяўлялі на міжнародным узроўні пра несправядлівае стаўленне да нацыянальных меншасцей у Другой Рэчы Паспалітай, аднак сітуацыя не мянялася да лепшага.

Асноўная частка беларусаў вучылася ў Чэхаславакіі, дзе ў міжваенны перыяд дзейнічала “руская акцыя” – праграма падтрымкі эмігрантаў з тэрыторыі былой Расійскай імперыі. Адным з асноўных кірункаў падтрымкі быў адукацыйны, у Чэхаславакіі дзейнічалі спецыяльныя ўстановы адукацыі для эмігрантаў, сур’ёзныя сумы былі накіраваныя на стыпендыі для студэнтаў, на развіццё інтэрнатаў, сталовак і бібліятэк.

Варта адзначыць, што частка беларусаў набывала адукацыю ў Германіі, дзе ў 1920-ыя гады праводзілася праца па стварэнню нацыянальных арганізацый. Некаторыя беларусы змаглі паступіць у вышэйшыя навучальныя ўстановы Злучаных Штатаў Амерыкі, аднак падобных прыкладаў у гісторыі міжваеннай эміграцыі зусім мала.

Слаба даследаваным фрагментам фарміравання беларускай дыяспары застаецца дзейнасць студэнтаў-беларусаў у Італіі. Асаблівасцю італьянскага студэнцкага асяродка стала навучанне ў Рыме будучых ксяндзоў, якія пераканаўча заяўлялі пра сваё беларускае паходжанне. Маладыя людзі настойліва і ўпарта на міжнародным узроўні распавядалі пра развіццё нацыянальнай свядомасці беларускага народа ў Заходняй

Репозиторий ВГУ

Беларусі. Юнакі вучыліся ў Грыгарыянскім і Арыентальным універсітэтах Рыма. Пра поспехі ксяндзоў-беларусаў рэгулярна пісалі перыядычныя выданні на Бацькаўшчыне, некаторыя газеты нават мелі спецыяльную рубрыку "Беларусы ў Рыме" (віленскія газеты "Biełaruskaya Krynica" і "Сын Беларуса").

Будучыя ксяндзы студэнты-беларусы выступалі на канферэнцыях з дакладамі пра свой народ, падкрэсліваючы сваё няпольскае паходжанне, прадстаўлялі інтарэсы беларусаў у разнастайных студэнцкіх аб'яднаннях. Напрыклад, у лістападзе 1925 г. у Рыме адбылося ўрачыстае святкаванне 1600-й гадавіны Нікейскага сабору, дзе прынялі ўдзел два беларускія студэнты Чарняўскі і Кулак ад імя беларускіх каталікоў [4, с. 8], пра што пісала віленская газета "Biełaruskaja Krynica".

Асобным кірункам дзейнасці студэнтаў за мяжой стала іх кансалідацыя ў міжнародныя арганізацыі. Самым буйным студэнцкім асяродкам беларусаў замежжа ў міжваенны час была Чэхаславакія, таму большасць маладзёжных арганізацый свой цэнтральны орган размяшчалі ў Празе. Да дзейнасці аб'яднанняў і саюзаў у Чэхаславакіі актыўна далучаліся беларускія студэнты ў Італіі.

Адной з найбольш значных арганізацый беларускай моладзі ў 1920-ыя гады стала Аб'яднанне беларускіх студэнцкіх арганізацый (АБСА), якое дастаткова хутка выйшла на міжнародны ўзровень. Беларускі грамадскі дзеяч замежжа Васіль Русак апісваў арганізацыйную работу па стварэнню АБСА наступным чынам: "Як вынік перагавораў між паасобнымі беларускімі студэнцкімі арганізацыямі (Praha, Vilna, Rym, Padebrady, Bratislava, Brno) была створана ў 1924 г. свая ўласная цэнтраля АБСА з тымчасовай сядзібаю ў Празе, якая зараз-жа па заарганізваню пачала супрацоўнічаць з чужаземным студэнцтвам" [3, л. 2]. Варта падкрэсліць, што сярод заснавальнікаў Аб'яднання беларускіх студэнцкіх арганізацый былі прадстаўнікі студэнцтва Італіі. Нягледзячы на тое, что беларусаў у Рыме было мала (каля дзесяці чалавек), яны адрозніваліся сваёй руплівай і мэтанакіраванай працай, высокім узроўнем матывацыі ў арганізацыйнай рабоце, актыўнай грамадскай пазіцыяй.

У 1926 г. АБСА было ўключана ў склад Міжнароднай студэнцкай канфедэрацыі (C.I.E.), дзе рэгулярна ўздымала пытанні дыскрымінацыі беларусаў у Другой Рэчы Паспалітай. Маючы дастаткова сціплы бюджэт, АБСА накіроўвала сваіх прадстаўнікоў на кангрэсы і канферэнцыі C.I.E. Міжнародная студэнцкая канфедэрацыя рэгулярна дасылала беларусам сваю прэсу, накіроўвала афіцыйныя лісты і рэзалюцыі.

Студэнты ў Італіі вялі актыўнае ліставанне з цэнтральнай суполкай Аб'яднання беларускіх студэнцкіх арганізацый. Лісты з Рыма захоўваюцца сярод калекцый дакументаў Беларускага дзяржаўнага архіва-музея літаратуры і мастацтва [2, л. 9]. Паводле адзначанага ліставання і матэрыялаў міжваеннай прэсы можна зрабіць выснову, што сваёй актыўнай грамадскай працай адзначыліся беларускія студэнты ў Італіі: Станіслаў Хлакоўскі, Антон Ройка, Франчук Чарняўскі.

Матэрыялы беларускамоўных газет міжваеннага перыяду сведчаць, што адным з найбольш здольных у навуковай і даследчыцкай працы стаў ксёндз Станіслаў Хлакоўскі. Пра беларуса пісалі не толькі газеты Вільні, але і прэса Ватыкана. "У артыкуле (перакладзеным з італьянскай мовы для газеты "Biełaruskaja Krynica") дакладна асвятляецца працэс паспяховай абароны дысертацыі Ст. Хлакоўскага ў Ватыкане 17 чэрвеня 1926 г., дзе беларускі ксёндз публічна прадставіў дысертацыю па тэме "Малітва паводле дзённіка Іаана Кранштадскага: "Маё жыццё ў Хрысце" (Oretio secundum diarium Ioannis de Cronstadt: "Mea vita in Christo") [5, с. 6], за якую атрымаў ступень доктара касцёльных усходніх навук.

Важнай старонкай рэлігійнай гісторыі беларускай дыяспары сталі ўзаемаадносіны беларусаў у Рыме і Папы Рымскага Пія XI (Pius XI). У гады пантыфіката Пія XI была ўстаноўлена дзяржава Ватыкан, яго ўплыў на развіццё міжнародных адносін у міжваенны час быў дастаткова высокім.

Цікавымі гістарычнымі фрагментамі былі ініцыятывы беларускіх студэнтаў у Італіі. У 1924 г. беларускія ксяндзы і студэнты ў Рыме пры падтрымцы нямецкага пасольства ў Ватыкане выступілі з прапановай адчыніць беларускую духоўную семінарыю [1, с. 1]. Гэта была ідэя арганізаваць нацыянальную навучальную ўстанову, якая б рыхтавала духавенства для беларускіх католікаў.

Неабходна падкрэсліць, што ў асяродку беларускай дыяспары ў міжваенны перыяд рэгулярна ўздымалася пытанне адкрыцця беларускай вышэйшай навучальнай установы за мяжой. Эмігранты разумелі яе значнасць у пытанні фарміравання нацыянальнай інтэлігенцыі. Шмат надзеяў было звязана з праектамі адкрыцця Беларускага народнага ўніверсітэта ў Коўна і Беларускага настаўніцкага інстытута ў Празе, аднак ідэі так і не былі рэалізаваныя ў выглядзе вышэйшых навучальных устаноў. Беларускі інстытут ў Празе не адчыніўся, хаця палітычныя дзеячы шмат казалі і пісалі пра яго перспектывы. Беларускі народны ўніверсітэт у Літве праводзіў заняткі толькі ў выглядзе курсаў для дарослых, аднак не даваў вышэйшую адукацыю сваім слухачам.

Беларуская семінарыя ў Рыме таксама не была адчыненая, бо на рашэнне Папы Рымскага Пія XI аказалі значны ўплыў польскія ксяндзы, якія пачалі выказваць бясконцае абурэнне, у тым ліку на старонках прэсы. Нягледзячы на супраціўленне палякаў, беларускае пытанне зацікавіла Папу, да якога ён зноў вярнуўся ў 1926 годзе. Да Папы Рымскага Пія XI на прыём былі запрошаныя беларускія студэнты, якія пераканаўча заявілі пра сваё беларускае паходжанне. Папа з цікавасцю атрымаў неабходную інфармацыю пра беларускі народ, што выклікала сапраўдную занепакоеннасць прысутных палякаў. "Dawioŭ ich da Papieża stary mnich italjaniec, jaki pradstawiŭ ich jak palakoŭ. Na heta adzin z ksiandzoŭ

Рэпазіторый ВГУ

studentaŭ adazwaŭsia: “my nie Palaki, a Biełarusy”. Paśla hetaha Papież bližej zacikawiŭsia studentami i wypytaŭ z jakich jany miajscoŭ biełaruskich,” [1, с. 1] – пісала пра сустрэчу газета “Biełaruskaja Krynica”. На падставе матэрыялаў прэсы становіцца відавочным той факт, што беларускія студэнты ў Рыме актыўна адстойвалі нацыянальныя інтарэсы, яны намагаліся на міжнародным узроўні абгрунтаваць факт развіцця цэнтраў беларускіх каталікаў у Другой Рэчы Паспалітай.

Беларускія ксяндзы ў Італіі павінны былі мець кантакты з каталіцкім цэнтрам у Злучаных Штатах Амерыкі, дзе прадстаўнікі касцёла таксама прымалі актыўны ўдзел у палітычным жыцці дыяспары. Беларускія каталікі ў Чыкага мелі значны ўплыў на ўсю нацыянальныя арганізацыі, яны праяўлялі сваю палітычную актыўнасць на міжнародным узроўні, праводзілі спецыяльныя набажэнствы для эмігрантаў. Адным з самых актыўных беларускіх ксяндзоў у ЗША быў ксёндз Янка Тарасевіч. Адной з важных ініцыятыў беларускіх эмігрантаў у ЗША стала ідэя адчыніць касцёл у Чыкага спецыяльна для каталікоў-беларусаў. Ідэя не была рэалізаваная, аднак такім чынам беларускія эмігранты спадзяваліся вылучыцца з ліку каталікоў-палякаў.

Такім чынам, грамадская дзейнасць беларускіх студэнтаў у Італіі была накіравана супраць інтэграцыі беларусаў у больш колькасную і арганізаваную польскую дыяспару. Ініцыятывы і праекты беларускіх студэнтаў Грыгарыянскага і Арыентальнага ўніверсітэтаў Рыма дапаўняць агульную спадчыну нацыянальнай дыяспары. Студэнты-беларусы ў Італіі актыўна супрацоўнічалі з беларускімі арганізацыямі ў іншых краінах свету, праяўлялі актыўнасць на міжнародным узроўні, прымалі ўдзел у кангрэсах і канферэнцыях.


1. Беларуская духоўная семінарыя ў Рыме // Сын Беларуса. – Вільня. – 3 верасня 1924 г. – № 35. – С. 1.
2. Беларускі дзяржаўны архіў-музей літаратуры і мастацтва (БДАМЛМ). – Ф. 3. Воп. 1. Спр. 184.
3. Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь (НАРБ). – Ф. 459. Воп. 1. Спр. 5.
4. Biełarusy ŭ Rymie // Biełaruskaja Krynica. – Wilnia. – 5 studnia 1926 h. – № 1. – S. 8.
5. Ksiondz biełarus – doktaram Papieskaha Uschodniaha Instytutu // Biełaruskaja Krynica. – Wilnia. – 30 cerwienia 1926 h. – № 21. – S. 6.


## ОРГАНИЗАЦИЯ И ПРОВЕДЕНИЕ ОПЫТНЫХ МОБИЛИЗАЦИЙ И МАНЕВРОВ НА ТЕРРИТОРИИ БЕЛАРУСИ В 1929 ГОДУ


В.М. Кривчиков (Гродно, Беларусь)


В последнее время возрастает интерес к изучению отечественной истории. Это отражается и на преподавании такого предмета, как «Военная история». Акценты переносятся на анализ развития группировок войск, дислоцировавшихся на территории Беларуси,показ их влияния на развитие нашего государства.

К одному из таких направлений военной истории относится изучение боевой выучки войск, которая играла первостепенное значение в способности Вооруженных Сил страны адекватно реагировать на внешние угрозы государства, в умении успешно, с наименьшими потерями вести боевые действия с противником.

Поэтому определенный интерес представляетпорядок организации и проведения на территории Беларуси опытных мобилизаций и маневров в 1920-е–1930-е года.

Партийное и военное руководство СССР уделяло большое внимание проведению с войсками Красной Армии различных учений и маневров, а также мобилизаций. Это в большей степени относится к войскам, дислоцировавшихся на территории Беларуси в межвоенный период. Беларусь находилась на стратегическом западном направлении СССР и Белорусский военный округ являлся приграничным округом с вытекавшими последствиями. В 1920-е–1930-е года интенсивность и динамика учений и мобилизаций на территории Беларуси постоянно возрастали, ввиду постоянного усиления военной угрозы со стороны западных соседей СССР.

Круг задач, решаемых и отрабатываемых на учениях и мобилизациях, также постоянно изменялся, что было связано с развитием стратегии и тактики боевого применения войск, а также совершенствованием вооружения и боевой техники, поступавших на обеспечение воинских частей. Не стал исключением и 1929 год.

Самым знаковым событием можно считать «Большие Бобруйские маневры 1929 года» (также называемые «Всесоюзные Бобруйские большие маневры»), прошедшие в сентябре 1929 г. в границах Белорусского военного округа.Это был смотр технической оснащенности Красной Армии, боевой выучки войск. Участие в маневрах, кроме войск Белорусского военного округа, принимали части Московского, Ленинградского, Украинского и Северокавказского военных округов.

На маневрах присутствовала большая группа руководящих командиров штаба Красной Армии во главе с Народным комиссаром обороны К.Е. Ворошиловым. На маневрах впервые в истории РККА участвовал опытный механизированный полк[1, с. 20].

Всего на маневрах от Белорусского военного округа участвовали два стрелковых корпуса (5-й и 16-й), 4 стрелковые дивизии(4-я, 8-я, 33-я и 37-я), две кавалерийские дивизии (6-я и 7-я), а также специальные части – бронетанковые, химических, зенитные, инженерные, связи и ВОСО.Авиация привлекалась из различных округов в количестве 320 легких и 16 тяжелых самолетов (таблица 1).


Репозиторий ВГУ